# Агледзіны пройдзенага шляху

З нагоды 85-годдзя Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага быў наладжаны шэраг мерапрыемстваў, галоўным з якіх, безумоўна, стала міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Дзіцячая бібліятэка — тэрыторыя чытання". Менавіта выхаванне ў хлопчыкаў і дзяўчынак любові да кнігі, прыцягненне іх да актыўнага чытання літаратуры — прыярытэтныя напрамкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк сталіцы, якія яны праз сваю цэнтралізаваную сістэму імкнуцца распаўсюдзіць і на адпаведныя ўстановы ўсёй рэспублікі. Сістэматызуецца і ўкараняецца ўсё лепшае, што ёсць у калег, вывучаецца замежны вопыт.

Юбілейная канферэнцыя ў бібліятэцы не стала выключэннем. Сваімі развагамі падзяліліся выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Валянціна Бігеза, выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў, загадчыца сектара дзіцячай літаратуры выдавецтва "Мастацкая літаратура" пісьменніца Алена Масла і іншыя ўдзельнікі. З цікавасцю слухалі на канферэнцыі і замежных гасцей: дырэктара ізраільскага культурна-адукацыйнага цэнтра Паліну Карыў, эксперта па бібліятэчнай справе са Швецыі Інгрыд Кэрсцін, турэцкага выкладчыка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта Эсада Харманджы і дырэктара Белгарадскай дзяржаўнай бібліятэкі імя А. Ліханава з Расіі Таццяны Пятровай. З дзейнасцю Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага за 85 гадоў існавання прысутных пазнаёміла дырэктар Таццяна Швед.

А закончыліся юбілейныя мерапрыемствы, што доўжыліся два дні, святочным вечарам. Пад дахам бібліятэкі быў наладжаны канцэрт, падчас якога гучалі таксама шматлікія віншаванні, уручаліся падарункі. Лепшыя бібліятэкары атрымалі дыпломы і граматы і ад Саюза пісьменнікаў Беларусі, які прадстаўлялі Міхась Пазнякоў і Наталля Касцючэнка. Цёпла было сустрэта і вясёлае паэтычнае віншаванне Анатоля Зэкава.

**Сяргей КРЫВІЧОЎ**